**Білет 21**

**Практычнае заданне.**

**Падзелы Рэчы Паспалітай, уваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі, змены ў становішчы розных слаёў насельніцтва Беларусі.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якія краіны ўдзельнічалі ў падзелах Рэчы Паспалітай?
2. Якія беларускія гарады ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі ў выніку І, ІІ і ІІІ падзелаў Рэчы Паспалітай?
3. Пры якой умове шляхта пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі магла захаваць свае землі?
4. Як змянілася становішча розных слаёў насельніцтва беларускіх зямель пасля іх далучэння да Расійскай імперыі.

**І. Картасхема “Падзелы Рэчы Паспалітай”**




**ІІ. Беларускія землі у складзе Расійскай імперыі ў канцы XVIII-пачатку XIX ст.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка “Гісторыя Беларусі. Канец XVIII – пачатак XX ст. 8 клас”)*

Усё насельніцтва, акрамя сялян, было прыведзена да прысягі Кацярыне II на працягу месяца.

Шляхце даваліся правы расійскага дваранства. За ёй, пры ўмове прысягі на вернасць Расіі, захоўваліся маёнткі [ ... ]. Але яна не магла ствараць канфедэрацыі, выбіраць манарха. Магнаты пазбавіліся права мець свае войска і крэпасці.

У гарадах адмянялася магдэбургскае права, на беларускія гарады распаўсюджваліся прынцыпы расійскага гарадскога самакіравання.

Значная частка беларускага сялянства пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі станавілася ўласнасцю расійскіх памешчыкаў і чыноўнікаў. Прававое і маёмаснае становішча дзяржаўных сялян, перададзеных ва ўласнасць памешчыкам, пагаршалася. Новыя ўладальнікі маглі іх прадаць, перасяліць у іншае месца [...].

У Беларусі замест ранейшага падатку з кожнага двара сталі браць падатак з кожнай душы мужчынскага полу. Уводзіліся таксама рэкруцкія наборы, якія прадугледжвалі пажыццёвую службу ў войску. У 1793 г. гэты тэрмін быў абмежаваны 25 гадамі. У рэкруты бралі мужчын ва ўзросце 19-35 гадоў.

**III. Картасхема. “Мяжа яўрэйскай аседласці”**

